УДК 81'373.21 (476.7)

В. М. Босак, д-р с.-г. навук, праф. (БДСГА, г. Горкі);
А. А. Босак, канд. філ. навук, дац. (БДЭУ, г. Мінск)

# НАЗВЫ НАСЯКОМЫХ Ў ГАВОРКАХ ВЕРХНЯГА НАД'ЯСЕЛЬДЗЯ

Тэрыторыя Верхняга Над'ясельдзя ўяўляе сабой надзвычай цікавы рэгіён Рэспублікі Беларусь, на тэрыторыі якога вылучаны сем адмысловых гаворах: гродзенска-баранавіцкія (панямонскія – уключаюць лыскаўскую і варанілавіцкую падгрупы) – на поўначы, паўночнабрэсцкія акаючыя – на захадзе (уключаюць роўбіцкую і вялікасельскую падгрупы), паўночнабрэсцкія окаючыя (уключаюць шанёўскую і шарашоўска-гараднянскую падгрупы) – у цэнтры, верхняясельдскія (уключаюць рудніцкую, смаляніцкую і ліноўскую падгрупы) – у цэнтры, на ўсходзе і паўднёвым усходзе, малецкія – на паўднёвым усходзе, паўночназагародскія – на паўднёвым захадзе, сярэднезагародскія – на поўдні, якія маюць значныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя асаблівасці [1–5].

Даследаванне па вызначэнню лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над'ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) праводзілася ў форме апытвання па спецыяльна распрацаванай праграме, якая ўключала 102 пытанні па лексіцы, у тым ліку па тэматычнай групе "насякомыя". З назвай насякомых зафіксаваны тры лексемы: 'божая кароўка', 'мурашкі', 'матылёк'.

Для назвы 'божай кароўкі' ўжываюцца фанетычныя, лексічныя і словаўтваральныя варыянты: *пэ́дэрка* /*пэ́дэрко*/, *па́здзерка* /*па́здзерко*/, *я́дзерко*, *пэ́ндрык* /*пэ́дрык*/, *сі́дэрко* /*сы́дэрко*, *сэ́дэрко*, *сы́дорок*/, *коло́да*, *корого́да*, *бо́жая каро́ўка* /*бо́жа каро́ўка*, *бо́жая коро́ўка*, *бо́жа коро́ўка*, *бо́жа коро́вка*/. Найбольш пашыраным і агульнавядомым з'яўляецца найменне *бо́жая каро́ўка* /*бо́жа каро́ўка*, *бо́жая коро́ўка*, *бо́жа коро́ўка*, *бо́жа коро́вка*/, якое выкарыстоўваецца ў гаворках паўночнай, заходняй і ў некаторых гаворках цэнтральнай частак Верхняга Над'ясельдзя. Назва *пэ́дэрка* /*пэ́дэрко*/ пераважае ў гаворках цэнтральнай і ўсходняй частак рэгіёна. Словы *сі́дэрко*, *сы́дэрко*, *сэ́дэрко*, *сы́дорок* уласцівы гаворкам паўднёвага захаду Верхняга Над'ясельдзя. Найменне *пэ́ндрык* /*пэ́дрык*/ утварае невялікі арэал на паўднёвым усходзе даследуемага рэгіёна; яно таксама зафіксавана ў гаворках двух населеных пунктаў: в. Казакі Пружанскага раёна і в. Дымнікі Камянецкага раёна. Лексема *коло́да* занатавана ў маўленні жыхароў в. Стараволя і в. Бакуны Пружанскага раёна. Найменне *корого́да* зафіксавана ў гаворцы в. Галасяціна Пружанскага раёна.

Для назвы ‘мурашак’ ужываюцца фанетычныя, лексічныя і акцэнтныя варыянты: *мура́шкі*, *мурашкі́* /*мурашкы́*$^{i}$, *мурашкы́*/, *мо́рахі* /*мо́рохі*, *му́рахі*, *му́рахы*$^{i}$/, *мураўі́* /*мурав’і́*, *мураўе́*/. Найбольш пашырана лексема *мурашкі́* /*мурашкы́*$^{i}$, *мурашкы́*/, якая ахоплівае гаворкі заходняй, паўднёва-заходняй, паўднёва-ўсходняй, а таксама некаторыя гаворкі цэнтральнай частак даследуемага рэгіёна. Лексема *мо́рахі* /*мо́рохі*, *му́рахі*/ утварае арэал у цэнтральнай частцы рэгіёна. Нарматыўная форма *мура́шкі* характэрна для гаворак паўночна-заходняй, лексема *мураўі́* /*мурав’і́*, *мураўе́*/ – для гаворак паўночна-ўсходняй частак даследуемага рэгіёна.

Для назвы ‘матылька’ ўжываюцца словаўтваральныя, фанетычныя і лексічныя варыянты: *матылёк*, *маты́ль*, *маты́лка* /*моты́лка*/, *пэрэпы́*$^{i}$*лка* /*пырыпы́*$^{i}$*лка*, *пырыпы́лка*/. Найбольш пашыранай з’яўляецца намінацыя *маты́лка* /*моты́лка*/. Яна выкарыстоўваецца ў гаворках цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй частак рэгіёна. Слова *маты́ль* ужываецца ў гаворках на поўначы і на захадзе Верхняга Над’ясельдзя, у некаторых гаворках ужываецца слова *матылёк*. Найменне *пэрэпы́*$^{i}$*лка /пырыпы́*$^{i}$*лка*, *пырыпы́лка/* характэрна для гаворак паўднёвага захаду рэгіёна.

Такім чынам, даследуемыя лексемы ў гаворках Верхяга Над’ясельдзя прадстаўлены нарматыўнымі ў літаратурнай мове і дыялектнымі формамі; у складзе намінацый адзначаны фанетычныя, лексічныя, словаўтваральныя і акцэнтныя варыянты.

## ЛІТАРАТУРА


1. Босак, А.А. Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над’ясельдзя). Лексіка / А.А. Босак, В.М. Босак. – Мінск, 2006. – 124 с.
2. Босак, А.А. Дыферэнцыяцыя гаворак Верхняга Над’ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак. – Мінск: БДТУ, 2010. – 160 с.
3. Босак, В.М. Гаворкі Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Вестник БГСХА. – 2020. – № 3. – С. 255–258.
4. Босак, В.М. Даследаванне гаворак Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Труды БГТУ: История, философия, филология. – 2013. – № 5. – С. 161–163.
5. Босак, В.М. Лінгвагеаграфічнае даследаванне лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над’ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Труды БГТУ. Серия 4: Принт- и медиатехнологии. – 2017. – № 1. – С. 91–95.